ее парламентской фракцией стратегия ответственной оппозиции может содействовать дальнейшему улучшению имиджа партии в глазах населения. Кроме того, увеличиваются шансы М. Ле Пен на успех на президентских выборах 2027 г. в силу того, что к настоящему времени у нее нет сильных конкурентов среди политиков страны в борьбе за президентский пост.

Таким образом, французская партийно-политическая система продолжает сохранять переходный характер, что делает весьма вероятными новые качественные изменения политического ландшафта страны.

**Библиографический список**

1. https:/www./ipsos.com/sites/default/files/ct/news/documents/2022-06/Sondage%20Sopra%20Steria_Comprendre%20vote%20des%20Français_12%20juin%20 2022%2020h. pdf (Дата обращения: 14.06.2022).
2. https://www. ipsos.com/sites/default/files/ct/news/documents/2022-10/Ipsos%20-%20Fractures%20Françaises%20-%20septembre_2022%20-%20V2. pdf (Дата обращения: 04.10.2022).

# РАДА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО XV–XVI ВВ. В СОВРЕМЕННОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ИСТОРИОГРАФИИ

***И. В. Красинский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; ikrasinski@yandex.by*

В исследовании автор проанализировал проблему изучения Рады Великого Княжества Литовского XV–XVI вв. в современной отечественной историографии. Выделены основные историографические работы по проблеме исследования в период 90-х гг. XX в. – первая четверть XXI в. Обращено внимание на функции Рады Великого Княжества Литовского, эволюцию Рады как органа государственной власти в политической системе княжества, сделаны выводы об изученности проблематики.

***Ключевые слова:*** Великое Княжество Литовское; Паны-Рада; Рада ВКЛ; отечественная историография истории ВКЛ.

# RADA OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA OF THE XV–XVI CENTURIES IN MODERN NATIONAL HISTORIOGRAPHY

***I. V. Krasinsky***

*Belarusian State University, Independence ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; ikrasinski@yandex.by*

In the study, the author analyzed the problem of studying the Rada of the Grand Duchy of Lithuania of the XV–XVI centuries in modern Russian historiography. The main

historiographical works on the problem of research in the period of the 90s of the twentieth century – the first quarter of the XXI century are highlighted. Attention is drawn to the functions of the Rada of the Grand Duchy of Lithuania, the evolution of the Rada as a state authority in the political system of the Principality, conclusions are drawn about the study of the problems.

***Keywords:*** Grand Duchy of Lithuania; Pani-Rada; Lithuanian Council of Lords; national historiography of history Grand Duchy of Lithuania.

## РАДА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XV–XVI СТСТ. У СУЧАСНАЙ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***І. В. Красінскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; ikrasinski@yandex.by*

У даследаванні аўтар прааналізаваў праблему вывучэння Рады Вялікага Княства Літоўскага XV–XVI стст. у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. Вылучаны асноўныя гістарыяграфічныя працы па праблеме даследавання ў перыяд 90-х гг. ХХ ст. – першая чвэрць XXI ст. Звернута ўвага на функцыі Рады Вялікага Княства Літоўскага, эвалюцыю Рады як органа дзяржаўнай улады ў палітычнай сістэме княства, зроблены высновы аб вывучанасці праблематыкі.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае; Паны-Рада; Рада ВКЛ; айчынная гістарыяграфія гісторыі ВКЛ.

Рада Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) з’яўлялася вышэйшым органам улады, які зацвердзіўся ў якасці дзяржаўнага інстытута падчас княжання Вітаўта і дзейнічаў да падпісання Люблінскій уніі (1569). Даследаванні па дзейнасці, кампетэнцыях, персанальным і колькасным складзе Рады распачаліся яшчэ ў дарэвалюцыйны час, але не адзначаліся сістэматызаванасцю і грунтоўнасцю. У савецкі перыяд цікаўнасць да вывучэння дзяржаўнага ладу ВКЛ значна паменшылася, у першую чаргу, па дзяржаўна-ідэалагічных прычынах. Хваля інтарэсу даследчыкаў да вывучэння Рады ВКЛ узнікла напрыканцы ХХ ст. Як замежная, так і айчынная гістарыяграфія набылі новыя якасныя рысы ў сувязі з насычэннем новымі метадалагічнымі падыходамі ў вывучэнні падзей і з’яў далёкай мінуўшчыны.

Адной з першых абагульняючых прац па гісторыі Беларусі былі «Нарысы гісторыі Беларусі» [12]. Артыкул пра дзейнасць Рады напісаны вядомым айчынным медыевістам П. А. Лойкам. Аўтар разглядае Раду як орган улады ў кантэксце палітычнай гісторыі княства, у прыватнасці, выканання знешнепалітычных функцый. Высвятляецца ўдзел беларускіх магнацкіх радоў у дзейнасці Рады. Зроблены акцэнт на барацьбе магнатаў праваслаўнага веравызнання за ўдзел у кіраванні дзяржавай.

Адным з першых даследчыкаў гісторыі дзяржавы і права на беларускіх землях з’яўляецца Я. А. Юхо [19; 20]. На думку аўтара, Рада ВКЛ складалася з наймагутнейшых паноў, якія валодалі вялізарнымі маёнткамі і васальна залежнай шляхтай, дапамагалі вялікаму князю ажыццяўляць уладу ў княстве. Значнасць Рады падкрэслівае наступны факт: менавіта паводле рашэнняў паноў радных вялікія князі Віцень (1295–1316) і Ягайла (1377–1392) зацвердзіліся на прастоле. Як самастойны орган дзяржаўнай улады Рада вылучаецца ў 1440-я гг. і набывае шырокія паўнамоцтвы згодна з прывілеем Аляксандра (1492). Даследчык піша, што вялікія князі раіліся з панамі раднымі па розных справах [21]. Напрыклад, вялікі князь Гедымін (1316–1341), па звестках з паведамлення каталіцкага пасольства (1324), меў 20 раднікаў. Найбольшая колькасць паноў радных дасягала 30–40 чалавек, а для легітымізацыі пасяджэнняў дастаткова было ўдзелу 3–5 паноў.

Я. А. Юхо разглядае кампетэнцыі Паноў-Рады. Так, Рада выконвала судовыя функцыі, распараджалася дзяржаўнай маёмасцю, замяшчала і абірала вялікіх князёў, вяла міжнародныя зносіны, вырашала пытанні абароны дзяржавы, выконвала заканадаўчыя і кантрольныя функцыі. Наяўнасць дадзеных кампетэнцый можна заўважыць у такіх крыніцах, як Судзебнік 1468 г., прывілеі (Бельскі 1564 г.), Статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588) [21]. Варта адзначыць, што размеркаванне ўлады паміж Радай і вялікімі князямі залежыла ад палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурна-рэлігійнай кан’юнктуры. Вялікі князь мог запрашаць на пасяджэнні Рады любых іншых асоб, якія з’яўляліся ўраджэнцамі княства, адносіліся да шляхецкага саслоўя і прытрымліваліся хрысціянскага веравызнання. Залежнасць вялікага князя ад Рады заключалася ў тым, што ніводны дзяржаўны дакумент без пячаткі і подпісу канцлера не мог уступіць у сілу.

В. Ф. Шалькевіч, С. А. Падокшын, С. Ф. Сокал, Т. І. Доўнар значна пашырылі звесткі аб дзяржаўна-палітычным развіцці ВКЛ і эвалюцыі Рады ў якасці органа дзяржаўнай улады [18; 9; 10]. У гэтых працах навукоўцы высвятляюць асновы дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага, вылучаюць інстытуты дзяржаўнай улады, часткова разглядаюць функцыі Рады, робіцца аспект на рашаючай ролі паноў радных ва ўзаемаадносінах з манархам, асабліва з канца XV ст. У абагульняючай працы па гісторыі дзяржавы і права на Беларусі пад рэдакцыяй А. Ф. Вішнеўскага адзначаецца залежнасць вялікага князя ад Рады праз неабходнасць падпарадкавання меркаванням паноў радных [5]. Аўтар падкрэслівае, што кампетэнцыі Рады

нічым дакладна не вызначаліся і тычыліся розных пытанняў унутранай і знешняй палітыкі.

Даследаванні акрэсленай праблемы комплексна апісаны ў агульнай шасцітомнай працы па гісторыі Беларусі (2 том) П. А. Лойкам [6]. Высвятляюцца такія моманты, як час узнікнення Паноў-Рады, асабісты склад, эвалюцыя ў сістэме дзяржаўнай улады. На погляд аўтара, момантам узрастання ўплыву Рады была Грамадзянская вайна 1430-х гг., падчас якой буйнейшыя феадалы замацавалі свае пазіцыі. Вялікі князь Казімір IV на працягу свайго кіравання быў вымушаны звяртацца да паноў радных, каб ухваліць тое ці іншае рашэнне. Канчатковы склад Рады быў вызначаны падчас княжання Аляксандра (1492–1506) і Жыгімонта I Старага (1506–1548). У I Статуце ВКЛ 1529 г. роля Рады была замацавана на дзяржаўным узроўні. Колькасны склад Рады ў 1565–1569 гг. вагаўся ад 45 да 65 асоб. Сярод асноўнага складу Рады вылучаліся т. зв. «старшыя паны радныя» агульнай колькасцю не болей за 12 чалавек. П. А. Лойка, акрамя вышэйназванага артыкула, з'яўляецца аўтарам манаграфіі «Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст.», у якой больш пашырана крануў пытанне афармлення Рады ў якасці органа дзяржаўнай улады ВКЛ [11].

Дадзеныя сведчанні таксама апісвае П. Ф. Дзмітрачкоў [8]. У кантэксце Грамадзянскай вайны 1430-х гг. развіццё Рады адзначае І. Ю. Увараў [13]. Акцэнт на судовых паўнамоцтвах Рады і вялікага князя зроблены ў працах А. І. Басалай, І. Г. Яцкевіч [2; 22].

Ролю Рады ВКЛ у сістэме дзяржаўнай улады разглядаў В. В. Цішчанка. Так, у двух яго артыкулах адзначаецца істотны рост уплыву Рады пасля Грамадзянскай вайны 1432–1439 гг. [14; 15]. З гэтага часу ўсё часцей патрабуецца падпісанне міжнародных дакументаў не толькі вялікім князем, але і яго раднікамі, што падцвярджаецца дамовамі 1444 і 1447 гг. з крыжакамі, 1471 г. – з Ноўгарадам, 1480 г. – з Псковам. Рада выконвала дыпламатычныя функцыі падчас знаходжання вялікага князя ў Польшчы, а ў надзвычайных абставінах імкнулася праводзіць незалежную, нават процілеглую вялікаму князю палітыку. Аўтар адзначае, што часам пераўтварэння Рады ў рэальна дзеючы орган улады адбыўся падчас княжання Казіміра IV (1440–1492) з прыняццем прывілея 1492 г. Больш дакладна дадзены працэс даследчык апісвае яшчэ ў адным сваім артыкуле [17]. Ён спасылаецца на артыкулы 14, 27, 29 і 33 прывілея 1492 г. і артыкулы Статута 1529 г. з мэтай адзначыць належнасць судовых функцый як вялікаму князю, так і панам радным. Склад раднікаў у судзе вагаўся ад 2–3

да 20 асоб. Такая колькасць абумоўлена складанасцю, працягласцю і важнасцю судовых працэсаў. Паны радныя не заўсёды прысутнічалі на судовых працэсах, некаторыя суды вялікі князь мог праводзіць нават без раднікаў альбо з асобамі не з Рады. Вялікакняжацкі суд быў адзінай падзеяй, якая не магла абысціся без удзелу паноў радных. Даследчык робіць выснову, што ў 1492–1529 гг. вялікі князь значна губляе сваю ўладу з-за неабходнасці звяртацца ў судовых справах да вышэйшай арыстакратыі краіны.

Важнай працай В. В. Цішчанкі ў даследаванні дзяржаўнага лада ВКЛ у сучаснай беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца яго кандыдатская дысертацыя [16]. Аўтарам былі ўведзены ў навуковы зварот новыя архіўныя і апублікаваныя крыніцы, зроблены сістэматызаваныя высновы. У працы разглядаецца паступовы працэс змяншэння ўлады вялікіх князёў літоўскіх на карысць Рады ВКЛ. Даследчык піша, што вялікі князь быў вышэйшым распарадцам зямельнай уласнасці і фінансава-эканамічных рэсурсаў ВКЛ, але на працягу XV ст. фактычна і юрыдычна падзяліў гэтыя паўнамоцтвы з вышэйшай арыстакратыяй краіны ў выглядзе Рады. У часы Вітаўта былі зроблены захады ўсталявання абсалютнай улады, што абгрунтоўваецца ліквідацыяй удзельных княстваў, падпарадкаваннем старой арыстакратыі і ўзвышэннем новых і залежных ад вялікага князя намеснікаў, якія маглі страціць свой статус у любы момант. Вітаўт валодаў паўнатой заканадаўчай, судовай і выканаўчай улады. Падчас крызісу 1430-х гг. створаны пры Вітаўце дзяржаўны савет выйшаў на новы якасны ўзровень. Унутрыпалітычная кан'юнктура спрыяла ўзвышэнню паноў радных. Пасіўная знешняя палітыка Казіміра IV (1440–1492) і адмова ад «рускай знешнепалітычнай праграмы», прыняцце прывілея 1447 г. і Судзебніка 1468 г. значна пашырылі ўдзел Рады ў кіраванні дзяржавай і фактычна пераўтварылі дадзены орган улады ў рэальна дзеючы. Прывілеі 1492 і 1506 гг. замацавалі Раду ў якасці дзяржаўнага органа ўлады. Судовыя функцыі, дыпламатычныя рашэнні, ваенныя справы вырашаліся вялікімі князямі пры актыўным удзеле Рады. У той жа час вялікі князь юрыдычна не павінен быў разглядаць дадзеныя з панамі раднымі і мог прымаць самастойныя рашэнні, што здаралася досыць часта.

В. М. Бічун у сваіх працах аналізуе прававы падмурак размеркавання ўлады ў ВКЛ [3; 4]. Адзначаецца, што Рада, як фармальна дзеючы орган улады, узнікае ў XIV ст., пераўтвараецца фактычна ў дзяржаўны савет, які мае сур'ёзны ўплыў на рашэнні вялікага князя, які ўсё роўна застаецца цэнтральнай фігурай дзяржаўнага ладу ВКЛ. Аўтар падзяляе Раду на дзве

часткі – вышэйшую (паны радныя) і ніжэйшую (мясцовая шляхта). У іншай публікацыі аўтар разглядае пытанне цэнтралізацыі ўлады ў княстве, акцэнтуе ўвагу на выкананні Радай ролі балансуюга органа ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання [4]. Абставінамі, пасля якіх Рада набыла заканадаўчыя функцыі, стаў канфлікт паміж вялікім князем і магнатамі ў сярэдзіне XV ст. Тоесныя высновы робяць Е. І. Арлоўская і А. А. Дамарад [1; 7].

Такім чынам, асноўная ўвага аўтараў айчыннай гістарыяграфіі скіравана на вывучэнне кампетэнцый, персанальнага складу, уплыву Рады ВКЛ на дзяржаўна-палітычныя працэсы. На дадзены момант праблематыка шматлікіх аспектаў дзейнасці Рады ВКЛ засталася па-за увагай даследчыкаў. Напрыклад, фрагментарна прадстаўлены персаналіі Рады, умоўна акрэслены функцыі, не вызначаны канкрэтны ўплыў чальцоў Рады на вялікіх князёў літоўскіх. Супярэчлівай з’яўляецца агульнапрынятая пазіцыя наконт абсалютнай улады вялікага князя Вітаўта. Не ўлічваюцца такія асаблівасці, як дэцэнтралізацыя дзяржавы, дысбаланс у развіцці этнічных літоўскіх і беларускіх зямель.

Трэба адзначыць, што Рада ВКЛ яшчэ ніколі не выступала ў якасці паўнавартаснага прадмета даследавання з боку беларускіх гісторыкаў. Гэтыя хібы абумоўлены адсутнасцю традыцыі ўстойлівай цікавасці даследчыкаў да праблемы, асаблівасцю развіцця і раскіданасці архіўных фондаў, ідэалагічнымі прычынамі гісторыі Беларусі XX ст.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Орловская Е. И. Роль шляхты в развитии парламентской системы в Великом Княжестве Литовском (XIV–XVI вв.) // Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 года і яго гісторыка-тэарэтычнае асэнсаванне: матэрыялы міжнар. навук. -практ. круглага стала, прысвеч. юбілею гісторыка права, д-ра юрыд. навук, праф. Т. І. Доўнар, Мінск, 11 кастр. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Балашэнка (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2019. С. 277–281.
2. Басалай А. І. Гаспадар і Рада Вялікага княства Літоўскага ў судовай сістэме дзяржавы (канец XV – першая палова XVI ст.) // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. Мінск: БДУ, 2012. № 3. С. 70–73.
3. Бічун В. М. Аб праблемах цэнтралізацыі ўлады ў Вялікім Княстве Літоўскім і Кароне Польскай // Современная государственность и право: теоретические и практические проблемы формирования и успешного функционирования: материалы междунар. науч. -практ. конф., посвящ. 75-летию со дня рождения заслуж. юриста Респ. Беларусь д-ра юрид. наук, проф. А. М. Абрамовича, Минск, 24–25 мая 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: С. А. Балашенко (гл. ред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2019. С. 103–106.
4. Бічун В. М. Прававы статус главы дзяржавы ў Вялікім княстве Літоўскім (другая палова XIV–XVI стст.) // Государство и право в условиях глобализации: материалы междунар. науч. конференции студентов, магистрантов и аспирантов, Минск, 1–2

ноября 2019 г. / БГУ, Юридический фак. ; [редкол.: А. А. Пухов (отв. ред.) и др.]. Минск: БГУ, 2020. С. 44–45.
5. Вішнеўскі А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэб. дап. Мн.: Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. 319 с.
6. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага; рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мн.: Экаперспектыва, 2008. 688 с.
7. Дамарад А. А. Эвалюцыя правоў і прывілеяў шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – пачатку XVI ст. // Труды БГТУ. Серия 6: История, философия. 2017. № 1 (197). URL: https://cyberleninka.ru/article/n/evalyutsyya-pravo-i-pryvileya-shlyahty-vyalikaga-knyastva-lito-skaga-u-kantsy-xiv-pachatku-xvi-st (Дата звароту: 19. 09. 2022).
8. Дзмітрачкоў П. Ф. Старажытнарускія дасягненні і традыцыі ў развіцці дзяржаўнасці і права на беларускіх землях у перыяд ВКЛ (другая палова XIII – першая палова XVI ст.) // Беларускі гістарычны часопіс: навукова-тэарэтычны, навукова-метадычны часопіс / заснавальнікі: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, РУП Выдавецтва "Пачатковая школа", Інстытут гісторыі НАНБ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 2009. № 4. С. 3–9.
9. Дзяржаўнасць і права Беларусі са старажытных часоў да канца XVI стагоддзя / Нац. АН Беларусі. Ін-т філас. і права, Бел. дзярж. ін-т правазнаўства. Мн., 1999. (Гісторыя Бацькаўшчыны. Дадатак да часопіса "Права і эканоміка"). – УДК: 340(476)(091). Ч. 4. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI–XVII ст. ст. 2-е выд. дапоўн. Мн., 2000. 120 с.
10. Доўнар Т. І. Вытокі беларускага парламентарызму // Право и демократия: сб. науч. тр. / редкол.: В. Н. Бибило (гл. ред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2004. Вып. 15. С. 3–13.
11. Лойка П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск: БДУ, 2002. 98 с.
12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1 / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]. Мн.: Беларусь, 1994. 527 с.
13. Уваров И. Ю. Развитие институтов государственной власти в Великом Княжестве Литовском в XV–XVI вв. // Веснік МДПУ імя І. П. Шамякіна. 2009. № 3 (24). URL: https://cyberleninka.ru/article/n/razvitie-institutov-gosudarstvennoy-vlasti-v-velikom-knyazhestve-litovskom-v-xv-xvi-vv (Дата обращения: 19. 09. 2022).
14. Цішчанка В. В. Арганізацыя дыпламатычнай службы ў ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст. // Журнал международного права и международных отношений. 2005. № 3. С. 51–56.
15. Цішчанка В. В. Велікакняжацкая ўлада ў ВКЛ у 30-я гг. XV ст. // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. 2005. № 3. С. 3–8.
16. Цішчанка В. В. Велікакняжацкая ўлада ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст.: дыс. на суіск. вуч. ст. к. гіст. н: 07. 00. 02. Мн., 2006. 118 л.
17. Цішчанка В. В. Вялікі князь літоускі як суддзя у 1492–1529 гг. (Практычны і юрыдычны аспекты дзейнасці) // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 3 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2008. С. 65–73.
18. Шалькевіч В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мінск: Грамадскае аб'яднанне "Маладзежнае навуковае супольніцтва", 2002. 247 с.
19. Юхо Я. А. Дзяржаўнасць і права Беларусі са старажытных часоў да канца XVI стагоддзя / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут філасофіі і права, Беларускі недзяржаўны інстытут правазнаўства. Ч. 1. 99 с.

20. Юхо Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск: Універсітэцкае, 1992. 269 с.
21. Юхо Я. А. Судзебнік 1468 г. Статуты Вялікага княства Літоўскага // Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск: РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. С. 201–217.
22. Яцкевіч І. Г. Роль судебных решений Великого князя и Панов-Рады в процессе правообразования в Великом Княжестве Литовском в первой половине XVI в. // Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі: матэрыялы міжнар. навук. -практ. канф., прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння І. А. Юхо. Мінск, 18–19 сак. 2011 г. Мінск, 2011. С. 89–91.

# ПРЫНЦЫПЫ ФАРМІРАВАННЯ ГУБЕРНАТАРСКАГА КОРПУСА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1864–1917 гг.

***Я. М. Ляпешкін***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Lia. Yauhen@gmail.com*

Разглядаюцца фактары, абставіны і асаблівасці падбору, прызначэння і звальнення губернатараў на тэрыторыі Беларусі ў 1864–1917 гг. Адзначаецца, што кіраўнікі губерняў прызначаліся на пасады і звальняліся з іх імператарам па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў. Устаноўлена, што перад тым як узначаліць губерню, існавала фармальная працэдура, якая ўключала тры этапы: кандыдацтва, знаходжанне на пасадзе і зацвярджэнне. Вызначаны прычыны губернатарскіх звальненняў. Зроблена выснова, што ў Беларусі, акрамя міністра ўнутраных спраў, значную ролю ў прызначэннях і звальненнях губернатараў адыгрываў генерал-губернатар (калі існавала гэта пасада).

***Ключавыя словы:*** прызначэнні і звальненні губернатараў; міністр унутраных спраў; генерал-губернатар; беларускія губерні.

# ПРИНЦИПЫ ФОРМИРОВАНИЯ ГУБЕРНАТОРСКОГО КОРПУСА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1864–1917 гг.

***Е. Н. Лепешкин***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Lia. Yauhen@gmail.com*

Рассмотрены факторы, обстоятельства и особенности подбора, назначения и увольнения губернаторов на территории Беларуси в 1864–1917 гг. Отмечается, что губернаторы назначались на должности и увольнялись с них императором по представлению министра внутренних дел. Установлено, что перед тем как стать главой губернии, существовала формальная процедура, включавшая три этапа: кандидатство, пребывание в должности и утверждение. Определены причины отставки губернаторов. Сделан вывод, что в Беларуси, помимо министра внутренних дел, значительную роль в назначении и увольнении губернаторов играл генерал-губернатор (когда такая должность существовала).

***Ключевые слова:*** назначения и увольнения губернаторов; министр внутренних дел; генерал-губернатор; белорусские губернии.